Я Ў ШКОЛЕ –
НА СВАІМ МЕСЦЫ

ЧЫРВОНКА

НА ТЭЛЕБАЧАННІ
ВАЖНА
ЗАСТАВАЦЦА САБОЙ

ЧЫРВОНКА

Выдаецца
з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

23 ЛІСТАПАДА 2023 г. ЧАЦВЕР № 227 (30107)

КАРАТКА

- **Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі ў 2025 годзе плануюць правесці ў Ніжнім Ноўгарадзе.**
- У Гродзенскай вобласці за дзесяць месяцаў пабудавалі амаль 60 тыс. кв. м жылля з электраацяпленнем.
- **Забароны выхаду на лёд увялі ў 17 раёнах Віцебскай вобласці.**
- Фільмы аб нацыянальных парках «Прыпяцкі» і «Белавежская пушча» плануюць зняць на «Беларусьфільме».
- **Мабільны каток каля Палаца спорту ў Мінску адкрыў сезон.**

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«І ЭКАНОМІКА, І ПАЛІТЫКА, І ГУМАНІТАРНАЯ СФЕРА Ў НАС З ТАДЖЫКІСТАНАМ РАЗВІВАЮЦЦА НЯДРЭННА»

Сустрэча лідараў дзвюх краін прайшла ў Палацы Незалежнасці

Адным з першых на сесію Савета калектыўнай бяспекі ў Мінск прыляцеў Прэзідэнт Таджыкістана. Першае мерапрыемства ў графіку Эмамалі Рахмона — сустрэча з Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам.

Фота БелТА.

«Сустракаю вас як сябра. Вы вельмі блізкі беларускаму народу. Вас вельмі добра ведаюць і не толькі таму, што мы з вамі, ужо можна сказаць, доўгажыхары. Вас паважаюць за вашу адкрытасць, прастату, душэўнасць, як і ўвесь таджыкскі народ», — прывітаў госця Аляксандр Лукашэнка. Ён падкрэсліў, што сёння ва ўсіх дзяржаў няпростая абстаноўка. «У вас заўсёды яна была няпростая, вас там з поўдня падагараюць увесь час. Ведаю, што няпроста, але я заўсёды дзіўлюся таму, як вам удаецца ў гэтай сітуацыі трымаць эканоміку», — сказаў беларускі лідар. Ён прызнаўся, што вельмі рады поспехам Таджыкістана ў электраэнергетыцы. Па яго словах, продаж вялікай колькасці электраэнергіі будзе добрым прыбыткам працавітаму таджыкскаму народу.

СТАР. 2

ЦЫТАТА ДНЯ

Максім ЕРМАЛОВІЧ, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта:

«Прынцып сацыяльнай адказнасці рэалізаваны ў многіх заканадаўчых актах, пачынаючы з Працоўнага кодэкса, заканчваючы лакальнымі нарматыўнымі дакументамі прадпрыемстваў па рэалізацыі канкрэтных сацыяльных праектаў. Гэты падыход пачаў увасабляцца ў жыццё з прыходам да ўлады Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі, які дакладна абазначыў задачы для бізнесу. Так, кожнае буйное і прыбытковае прадпрыемства краіны павінна ўносіць свой уклад у развіццё грамадства і рэалізоўваць сацыяльныя праекты. Сёння на кожным буйным дзяржаўным і многіх прыватных прадпрыемствах такі прынцып дзейнічае».

Доктар спяшаецца на выклік

Фота БелТА.

Дар'я МАРСКАЯ — малады спецыяліст. Яна ўзначаліла Брадзецкую сельскую амбулаторыю Бярэзінскага раёна Мінскай вобласці ў мінулым месяцы. Участак адказны — усяго на абслугоўванні амбулаторыі знаходзяцца 1032 чалавекі. Прыйшла малады ўрач агульнай практыкі на добраўпарадкаванае працоўнае месца — летась у амбулаторыі зрабілі капітальны рамонт, было абноўлена абсталяванне, з'явілася гарачае водазабеспячэнне. У падпарадкаванні амбулаторыі — два сельскія ФАПы, дзе вядзецца фельчарскі прыём. Па традыцыі ў першай палове дня ўрач праводзіць прыём першасных і планавых пацыентаў, а пасля абеду едзе на выклікі.

Эканамікс

ЭКСПАРТ ПРАЛЬНЫХ МАШЫН ВЫРАС У ЧАТЫРЫ РАЗЫ

Пётр ПАРХОМЧЫК — аб бягучым стане прамысловага комплексу краіны і перспектывах развіцця

Нягледзячы на ўведзеныя супраць Беларусі санкцыі, айчынная прамысловасць дэманструе станоўчыя вынікі і стабільнае функцыянаванне. Гэта асноўны лейтматыў даклада «Аб забеспячэнні ўстойлівай работы прамысловага комплексу ў 2023 годзе і ходзе рэалізацыі імпартазамяшчальных праектаў» намесніка прэм'ер-міністра, які выступіў падчас сумеснага пасяджэння Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі, а таксама адказаў на пытанні парламентарыяў.

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

У НОВЫ ГОД – СА СТАРЫМ СЯБРАМ!

Ідзе падпіска на І паўгоддзе 2024 года.

Усім, хто падпісаўся на І квартал або І паўгоддзе 2024 года, у падарунак чатыры календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.

«І эканоміка, і палітыка, і гуманітарная сфера ў нас з Таджыкістанам развіваюцца нядрэнна»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Што датычыцца гандлёва-эканамічных адносін Беларусі і Таджыкістана, то, па словах Аляксандра Лукашэнкі, тавараабарот паміж краінамі пастаянна расце і сёлета можа дасягнуць 100 мільёнаў долараў. «Але я хачу, каб вы разумелі: мы гатовы вашу прадукцыю, асабліва сельскагаспадарчую, тую, якой у нас, на жаль, няма, купляць у любых аб'ёмах. У сувязі з гэтым Таджыкістан звярнуўся да нас з просьбай аб стварэнні тут магутнага гандлёвага цэнтра. Вы павінны ведаць, што мы ўсё зробім дзеля таго, каб ён тут быў. Мы прапанавалі вашым ініцыятарам тры месцы ў Мінску. Калі не задавальняе, падбяром яшчэ ўчастак. Гатовы сумесна з вамі ў гэтых адносінах працаваць», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён запэўніў, што ўся прадукцыя, якая вырабляецца ў Таджыкістане — алюміній, бавоўна, сельгаспрадукцыя і іншая, — будуць запатрабаваны ў Беларусі.

«Словам, і эканоміка, і палітыка, і гуманітарная сфера ў нас развіваецца нядрэнна. І ў ваенна-тэхнічных адносінах мы таксама працуем нядрэнна. Гатовы павялічваць аб'ёмы тавараабароту да такой ступені, у якой гэта неабходна дружалюбнаму нашаму Таджыкістану», — падсумаваў Аляксандр Лукашэнка.

Эмамалі Рахмон падзякаваў свайму беларускаму калегу за сардэчны прыём. «Я хацеў бы адзначыць паспяховае старшынства беларускага боку ў АДКБ. Мы вельмі ўдзячныя вам за вашы намаганні падчас старшынства ў гэтай арганізацыі. Мы зрабілі вельмі шмат», — адзначыў ён.

Таджыкскі лідар таксама падкрэсліў рост тавараабароту з Беларуссю. «Гэта значыць, ёсць добрая дынаміка развіцця нашых двухбаковых гандлёва-эканамічных сувязяў. Добра працуюць нашы сумесныя прадпрыемствы ў Таджыкістане. Гуманітарныя сувязі развіваюцца паспяхова», — сказаў ён.

Кіраўнікі дзяржаў абмеркавалі стан і перспектывы ўзаемадзеяння, міжнародную і рэгіянальную праблематыку.

Валерыя СЦЯЦКО.

Бяспека

За ўзаемапаважлівы дыялог, разрадку і разважнасць

Напярэдадні саміту АДКБ, які правядуць у беларускай сталіцы сёння, адбылося сумеснае пасяджэнне Савета міністраў замежных спраў, Савета міністраў абароны і Камітэта сакратароў саветаў бяспекі краін дзяржаў — удзельніц АДКБ.

Пасля перагавораў дэлегацый міністраў замежных спраў Беларусі Сяргей АЛЕЙНІК расказаў журналістам падрабязнасці сустрэчы.

Паводле слоў міністра, падчас пасяджэння адбыўся грунтоўны і даверны дыялог аб ваенна-палітычнай абстаноўцы ў рэгіёнах калектыўнай бяспекі АДКБ і ў прылеглых зонах, дынаміцы яе развіцця і ўплыве на бяспеку краін — членаў арганізацыі.

«Мы ўсе сышліся ў меркаванні, што сітуацыя ў сферы міжнароднай і рэгіянальнай бяспекі, на жаль, працягвае пагаршацца. У глабальным плане гэта абумоўлена сістэмным крызісам міжнародных адносін і непазбежнай трансфармацыяй старога светапарадку. На вялікі жаль, працягваюць мэтанакіравана разбурацца архітэктура еўразійскай бяспекі, дэвальвавацца механізмы раззбраення і кантролю над узбраеннямі», — сказаў Сяргей Алейнік.

Паводле яго слоў, апошні прыклад у гэтым сумным спісе — прыпыненне членамі НАТА дзеяння Дагавора аб звычайных узброеных сілах у Еўропе. Раней гэты дакумент быў адной з апор агульнаеўрапейскай бяспекі.

«Чым і калі запаўняць сістэмны прабел у сферы агульнаеўрапейскага кантролю над узбраеннямі, пакуль невядома, — адзначыў дыпламат. — Адсутнасць узаемнага даверу, паглыбленне канфрантацыі і адкрыта мілітарысцкая безадказная рыторыка з боку шэрагу заходніх палітыкаў не садзейнічаюць аднаўленню дыялогу па гэтым пытанні».

Дзейнасць АДКБ, падкрэсліў Сяргей Алейнік, мае абарончы характар. Арганізацыя нікому не пагражае, не ўмешваецца ў справы іншых дзяржаў і заўсёды выступала і выступае за ўзаемапаважлівы дыялог, разрадку і разважнасць.

«На знешнім перыметры АДКБ захоўваецца вельмі напружаная сітуацыя. На заходнім флангу ідзе непрапарцыянальнае і неабгрунтаванае нарошчванне ваенных патэнцыялаў краін — членаў НАТА, якія ў прынцыпе і так абаронены сваім членствам у блоку. Кратна павялічваюцца ваенныя бюджэты, колькасць узброеных сіл і іх канцэнтрацыя каля нашых граніц. «Праводзіцца вялікая колькасць вучэнняў, у тым ліку ў непасрэднай блізкасці ад зоны адказнасці Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы. Пры гэтым максімальна зніжаецца транспарэнтнасць, хоць мы са свайго боку стараемся дэманстраваць адкрытасць», — звярнуў увагу міністр.

У той жа час паўднёвыя граніцы АДКБ падвяргаюцца ўздзеянню шматлікіх і разнапланавых выклікаў і пагроз транснацыянальнага характару, такіх як тэрарызм і экстрэмізм, наркатрафік, нелегальная міграцыя.

Канфлікт ва Украіне прадаўжае заставацца болевым пунктам і галоўным дэстабілізацыйным фактарам ва Усходне-Еўрапейскім рэгіёне, адзначыў Сяргей Алейнік.

«У гэтых найскладанейшых геапалітычных умовах намаганні беларускага старшынства ў АДКБ былі накіраваны на павышэнне згуртаванасці нашай арганізацыі, кансалідацыю сумесных намаганняў па прадухіленні дэстабілізацыі ў нашай зоне адказнасці, умацаванні бяспекі яе дзяржаў-членаў. Менавіта гэтым быў абумоўлены і дэвіз беларускага старшынства «праз салідарнасць і супрацоўніцтва да міру і бяспекі». Намі былі абазначаны прыярытэтныя напрамкі старшынства на ўнутраным і знешнім контурах. На іх рэалізацыю нацэлены шырокі пералік мерапрыемстваў у палітычнай, ваеннай, ваенна-тэхнічнай сферах, а таксама па лініі процідзеяння транснацыянальным выклікам і пагрозам бяспецы», — расказаў кіраўнік беларускага МЗС.

Сітуацыя на Блізкім Усходзе, паводле слоў Сяргея Алейніка, таксама стала адной з тэм сумеснага пасяджэння. «Мы выказаліся за спыненне кровапраліцця і за мірнае ўрэгуляванне блізкаўсходняга крызісу, канфлікту палітыка-дыпламатычнымі сродкамі на аснове рэзалюцый Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, шляхам стварэння дзвюх дзяржаў», — сказаў міністр.

Па выніках перагавораў бакі адобрылі і падпісалі каля 20 дакументаў у палітычнай і ваеннай сферах, а таксама ў галіне процідзеяння сучасным выклікам і пагрозам бяспецы. Канчаткова зацвердзіць іх павінны кіраўнікі дзяржаў на сённяшняй сесіі Савета калектыўнай бяспекі.

Паводле БелТА.

Адміністрацыйныя працэдуры — у электронны фармат, бюджэт ФСАН — з прафіцытам

Сенатары адобрылі шэраг законапраектаў, у тым ліку па сацыяльным абслугоўванні

На пасяджэнні адзінаццатай сесіі Савета Рэспублікі сенатары адобрылі шэраг праектаў законаў, у прыватнасці «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб асновах адміністрацыйных працэдур», «Аб змяненні законаў па пытаннях сацыяльнага абслугоўвання і сацыяльных выплат», «Аб бюджэце дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь на 2024 год», «Аб ратыфікацыі Мемарандума аб абавязацельствах Рэспублікі Беларусь у мэтах атрымання статусу дзяржавы — члена Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва».

Фота БелТА.

ДЛЯ ДАСТУПНАСЦІ І ЗРУЧНАСЦІ

Якія змяненні прапануюцца для павышэння даступнасці і зручнасці адміністрацыйных працэдур, расказаў **міністр юстыцыі Сяргей ХАМЕНКА**, прадстаўляючы сенатарам праект закона «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб асновах адміністрацыйных працэдур».

Паводле слоў міністра, значны блок змяненняў накіраваны на комплекснае рэгуляванне пытанняў інфармацыйна-камунікацыйнага ўзаемадзеяння пры ажыццяўленні адміністрацыйных працэдур. Гэта абумоўлена тым, што цяпер актывізавана работа ўсіх дзяржаўных органаў па пераводзе працэдур у электронную форму. Менавіта шырокае прымяненне інфармацыйных тэхналогій створыць максімальную зручнасць, аператыўнасць і даступнасць гэтых паслуг для грамадзян і суб'ектаў гаспадарання. А гэта, безумоўна, дасць магчымасць забяспечыць практычную рэалізацыю патрабаванняў абноўленай Дырэктывы № 2.

Ён звярнуў увагу на тое, што цяпер адміністрацыйныя працэдуры, працэс якіх поўнасцю лічбавізаваны, адсутнічаюць. Размешчаныя на адзіным партале паслугі прадугледжваюць магчымасць электроннага ўзаемадзеяння толькі на стадыі падачы заявы. У якасці навел, накіраваных на павышэнне даступнасці, зручнасці і аператыўнасці ажыццяўлення адміністрацыйных працэдур, прадугледжана магчымасць падачы зацікаўленай асобай дакументаў незалежна ад яе месца жыхарства (месца знаходжання), а таксама выкарыстанне праактыўнага фармату.

Як адзначыў **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей СІВЕЦ**, новым дакументам уводзіцца такі інстытут, як праактыўны фармат рэалізацыі адміністрацыйнай працэдуры, калі тыя ці іншыя дзеянні ўпаўнаважаных дзяржаўных органаў звязаны з узнікненнем тых ці іншых юрыдычных падзей, напрыклад, нараджэннем дзіцяці, уступленнем у шлюб.

— Рэалізацыя самой адміністрацыйнай працэдуры не будзе залежаць ад заяўнага характару і дзеянняў самога грамадзяніна, а будзе з'яўляцца абавязкам упаўнаважанага дзяржаўнага органа — сабраць неабходны пакет дакументаў і праінфармаваць грамадзяніна аб надыходзе тых ці іншых прававых наступстваў. Такім чынам гэта вельмі важны праект заканадаўчага акта, які, безумоўна, насадзейнічае спрашчэнню працэдуры рэалізацыі грамадзянамі сваіх маёмасных правоў і ў перспектыве, калі ўся сістэма аказання электронных паслуг ужо будзе замкнута на адзіным партале электронных паслуг, паслужыць таму, што грамадзяне ў максімальна зручным для сябе рэжыме і максімальна аператыўна змогуць вырашаць усе пытанні, звязаныя са сваім жыццезабеспячэннем, — патлумачыў Сяргей Сівец.

ЗАДАЧЫ САЦЫЯЛЬНАЙ АБАРОНЫ БУДУЦЬ ВЫКАНАНЫ

Прадстаўляючы законапраект «Аб змяненні законаў па пытаннях сацыяльнага абслугоўвання і сацыяльных выплат», **міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ** адзначыла, што ва ўмовах дэмаграфічнага старэння насельніцтва клопат аб старэйшым пакаленні становіцца выклікам для ўсяго грамадства.

— У прыярытэце дзяржавы застаецца галоўны прынцып — максімальна стварыць умовы для старэння каля дамашняга ачага, — падкрэсліла Ірына Касцевіч.

Праект закона накіраваны на ўдасканаленне дзейных прававых механізмаў у сферы сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва і павышэння даступнасці сацыяльных паслуг на аснове індывідуальнай ацэнкі патрэбы грамадзян у такім абслугоўванні.

У ліку асноўных новаўвядзенняў — устанаўленне правоў і абавязкаў пастаўшчыкоў і атрымальнікаў сацыяльных паслуг; арганізацыя дзейнасці камерцыйных арганізацый, якія аказваюць сацыяльныя паслугі ў форме стацыянарнага сацыяльнага абслугоўвання, на падставе ліцэнзіі; дапаўненне пераліку паўнамоцтваў дзяржаўных органаў у галіне сацыяльнага абслугоўвання. Таксама прапануецца вызначыць пералік дзяржаўных устаноў сацыяльнага абслугоўвання, змяніць назву асобных устаноў (дамы-інтэрнаты на пансіянаты, спецыяльныя дамы на дамы (кватэры) суправаджальнага пражывання). Праектам закона таксама прадугледжана ўстанаўленне права арганізацыі па бясплатным падвозе работнікаў да аддаленых устаноў сацыяльнага абслугоўвання ў выпадку адсутнасці рэгулярных перавозак транспартам агульнага карыстання.

Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Дзмітрый ДЗЯМІДАЎ, каментуючы законапраект «Аб бюджэце дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь на 2024 год», адзначыў, што дакумент захоўвае сацыяльную скіраванасць.

— Падводзячы вынікі напаўнення бюджэту фонду ў бягучым годзе, мы можам канстатаваць, што ён выконваецца з прафіцытам. Прафіцыт звязаны з тым, што асноўныя адлічэнні робяцца з заработнай платы, а ў краіне яна расла, прычым нядрэннымі тэмпамі. Гэта дазволіла ў поўным аб'ёме дасягнуць запланаваных паказчыкаў па росце пенсій, стабільнай выплаце рознага віду дапамог. Прымаючы праект на наступны год, мы таксама закладваем бюджэт з прафіцытам. Пры гэтым мы бачым, што тыя прагнозныя паказчыкі па росце заработнай платы, якія прапісаў урад, таксама дазволяць у поўным аб'ёме выконваць задачы сацыяльнай абароны насельніцтва, якія стаяць перад фондам, прычым з сур'ёзным ростам, — адзначыў Дзмітрый Дзямідаў.

Алена КРАВЕЦ.

Парламенцкі дзённік

АБАРОНА НАЦЫЯНАЛЬНЫХ ІНТАРЭСАЎ І СПАЖЫЎЦОЎ

Шэраг дакументаў разгледзелі на чарговым пасяджэнні Палаты прадстаўнікоў

Змяненні чакаюцца ў заканадаўстве аб меліярацыі земляў, дарожным руху і абыходжанні з адходамі — адпаведныя законапраекты дэпутаты адобрылі ў другім чытанні. Таксама парламентарыі ратыфікавалі шэраг міжнародных пагадненняў і пратакол. Наша краіна спыняе ўдзел у Групе дзяржаў супраць карупцыі (ГРЕКО). Такое рашэнне прынята з мэтай забеспячэння нацыянальных інтарэсаў Рэспублікі Беларусь.

Фота БелТА.

НЕПАТРЭБНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

Праект Закона «Аб спыненні міжнародных дагавораў па пытаннях барацьбы з карупцыяй», разгледжаны ў адным чытанні, прадугледжвае дэнансацыю Беларуссю Канвенцыі аб крымінальнай адказнасці за карупцыю, Дадатковага пратакола да Канвенцыі, спыненне дзеяння Пагаднення адносна прывілегій і імунітэтаў, а таксама прызнанне страціўшымі сілу законаў нашай краіны, якімі гэтыя міжнародныя дагаворы ратыфікаваны Рэспублікай Беларусь. Анулююцца абавязацельствы па прадастаўленні прадстаўнікам членаў ГРЕКО і членам інспекцыйных груп гэтай міжнароднай арганізацыі прывілеяў і імунітэтаў, накіраваных на стварэнне спрыяльных умоў для іх работы на тэрыторыі нашай дзяржавы.

ГРЕКО — гэта міжнародная арганізацыя, асноўнай мэтай якой з'яўляецца павышэнне эфектыўнасці яе членаў у супрацьдзеянні карупцыі па сродках узаемнай ацэнкі выканання прынятых абавязацельстваў у гэтай галіне. ГРЕКО ўстанаўлівае антыкарупцыйныя стандарты дзейнасці дзяржавы і кантралюе адпаведнасць практыкі гэтым стандартам шляхам правядзення маніторынгаў.

Як адзначыў **генеральны пракурор Андрэй ШВЕД**, у нашай краіне праведзены чатыры раўнды ацэнкі ГРЕКО, па выніках чаго складзены справаздачы і дадзены рэкамендацыі па ўдасканаленні нацыянальнага заканадаўства і практыкі барацьбы з карупцыяй. Па яго словах, Генеральная пракуратура ва ўзаемадзеянні з іншымі зацікаўленымі дзяржаўнымі органамі і арганізацыямі прыкладала максімальныя намаганні па выкананні дадзеных рэкамендацый і накіроўвала адпаведную інфармацыю ў выканаўчы камітэт ГРЕКО. «Аднак многія рэкамендацыі насілі палітычны характар і патрабавалі ўнесці змяненні ў Канстытуцыю і нацыянальнае заканадаўства нашай краіны, што з'яўляецца непрымальным, — падкрэсліў Андрэй Швед. — Напрыклад, частка патрабаванняў прадугледжвала абмежаванне або адмену некаторых паўнамоцтваў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Ад нас патрабавалі змяніць заканадаўчыя акты, якія рэгламентуюць дзейнасць праваахоўных органаў і органаў выканаўчай улады. Варта адзначыць, што ГРЕКО нашы довады аб немагчымасці рэалізацыі гэтых патрабаванняў не ўспрымала, пастаянна крытыкавала нашу краіну за нездавальняючы ўзровень выканання, па іх меркаванні, рэкамендацый».

На думку **члена Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Андрэя ГАНЧУКА**, палітычныя патрабаванні, якія паступалі ад ГРЕКО, выходзяць за рамкі паўнамоцтваў гэтай міжнароднай арганізацыі і з'яўляюцца ўмяшальніцтвам ва ўнутраныя суверэнныя справы Рэспублікі Беларусь. «Як ідуць справы па барацьбе з карупцыяй у іншых краінах — удзельніцах ГРЕКО (напрыклад, краінах Прыбалтыкі, у Польшчы і ва Украіне), мы таксама добра ведаем — двайныя стандарты, — звярнуў увагу дэпутат. — Разам з тым Беларусь не адмаўляецца ад міжнароднага супрацоўніцтва не толькі па антыкарупцыйным заканадаўстве, але і па любым іншым, але пры ўмове, што такое супрацоўніцтва будзе насіць партнёрскі і ўзаемавыгадны характар. Што датычыцца міжнароднага супрацоўніцтва ў рамках антыкарупцыйнага заканадаўства, то Рэспубліка Беларусь працягне яго ў рамках Канвенцыі ААН па барацьбе з карупцыяй, якую наша краіна ратыфікавала ў 2004 годзе».

СУПРАЦЬДЗЕЯННЕ НЕЗАКОННАЙ МІГРАЦЫІ

Адпаведныя змяненні закрануць умовы знаходжання замежных грамадзян на тэрыторыі нашай краіны. У прыватнасці, удакладняецца пералік суб'ектаў, на якіх ускладаецца абавязак інфармаваць органы ўнутраных спраў аб выдзяленні памяшканняў для пражывання замежнікам, якія часова прыбываюць на тэрыторыю Беларусі. У адносінах да асоб, якія не будуць выконваць гэты абавязак, прадугледжана адміністрацыйная адказнасць.

У цяперашні час парадак інфармавання органаў унутраных спраў аб замежных грамадзянах ускладзены на гасцініцы, санаторна-курортныя і аздараўленчыя арганізацыі; суб'ектаў, якія аказваюць паслугі ў сферы аграэкатурызму, а таксама на юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія здаюць у арэнду жылыя памяшканні замежным грамадзянам.

«Правапрымяняльная практыка паказала, што асноўная частка замежнікаў прыбывае ў Беларусь з кароткатэрміновымі мэтамі і пражывае ў фізічных асоб, якія здаюць жылыя памяшканні па дагаворы найму, — адзначыў **міністр унутраных спраў Іван КУБРАКОЎ**. — Адпаведна дастаткова вялікі аб'ём звестак аб замежніках, якія пражываюць у памяшканнях, выдзеленых фізічнымі асобамі, не накіроўваецца ў органы ўнутраных спраў, бо ў апошніх няма такога абавязку. Толькі з дапамогай інфармацыйных рэсурсаў у 2022 годзе органы ўнутраных спраў атрымалі больш як 884 тысячы апавяшчэнняў аб замежніках, а за дзесяць месяцаў бягучага года — 863 тысячы апавяшчэнняў. З улікам сённяшніх рэалій адсутнасць такіх звестак можа неспрыяльна паўплываць на стан грамадскай бяспекі ў Рэспубліцы Беларусь».

Як падкрэсліў **член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Сяргей СЫРАНКОЎ**, любая дзяржава прымае тыя ці іншыя рычагі ўплыву на міграцыйную сітуацыю зыходзячы з тых працэсаў, якія ўплываюць на пытанні нацыянальнай бяспекі. «Беларусь не з'яўляецца выключэннем, — удакладніў дэпутат. — Мы пастаянна ўдасканальваем наша заканадаўства. Гэтае рашэнне прадыктавана як унутранай палітычнай сітуацыяй, так і глабальнымі грамадска-палітычнымі працэсамі, што адбываюцца за межамі нашай краіны. Рашэнне выклікана і тым, каб паставіць бар'еры незаконнай міграцыі ў нашу краіну».

КРЭДЫТЫ — ПА НОВЫХ ПРАВІЛАХ

У першым чытанні разгледжаны праект Закона «Аб крэдытных гісторыях». Удасканаленне дзеючага заканадаўства звязана з імклівым развіццём лічбавізацыі, павышэннем узроўню абароненасці суб'ектаў крэдытнай гісторыі ад махлярскіх дзеянняў, а таксама недапушчэннем нядобрасумленнага выкарыстання крэдытных справаздач карыстальнікамі крэдытных гісторый.

Як расказаў **намеснік Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па бюджэце і фінансах Віталь ВАСЮКОЎ**, пашыраецца пералік крыніц фарміравання крэдытных гісторый. «Сёння гэта банк або нябанкаўская фінансавая або мікрафінансавая арганізацыя, якая пры аказанні пэўнай паслугі перадае звесткі аб сваім кліенце (фізічнай або юрыдычнай асобе) у крэдытны рэгістр, — патлумачыў ён. — Цяпер, пашыраючы гэты пералік, сюды будуць уключацца юрыдычныя асобы, якія рэалізоўваюць сваю прадукцыю ў растэрміноўку. Напрыклад, гэта крамы, якія прадаюць мабільныя тэлефоны, камп'ютарную тэхніку, мэблю і гэтак далей. Новаўвядзенні дазволяць пашырыць звесткі аб асобе, якая бярэ тавар у крэдыт або ў растэрміноўку. Гэта мінімізуе рызыкі, звязаныя з аказаннем фінансавых паслуг, і абароніць спажыўцоў ад неабгрунтаваных фінансавых выдаткаў».

Вераніка КАНЮТА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Больш за два мільёны чалавек у сектары Газа маюць патрэбу ў тэрміновай харчовай дапамозе

Сама меней 2,2 мільёна чалавек у сектары Газа маюць патрэбу ў тэрміновай харчовай дапамозе. Аб гэтым заявілі ў Сусветнай харчовай праграме (СХП) ААН, паведаміла ТАСС. У заяве арганізацыі адзначаецца, што для таго, каб дапамагчы тым, хто мае патрэбу, СХП і партнёрам неабходны лепшы доступ і такія рэсурсы, як паліва, газ і сувязь. Арганізацыя мае намер аказаць харчовую дапамогу як мінімум 1,1 мільёна чалавек. Паводле яе ацэнак, дапамогу ўжо атрымала больш за 555 тысяч палестынцаў. Раней у арганізацыі заяўлялі, што з пачаткам канфлікту ў сектар Газа паступае ўсяго 10 працэнтаў неабходнага харчавання.

Германія падоўжыла сістэму кантролю на польскай граніцы

Сістэма кантролю на граніцы з Польшчай падоўжана яшчэ на 20 дзён, бо колькасць нелегальных уездаў у краіну скарацілася толькі цяпер — упершыню з лютага, паведаміў Euronews. У кастрычніку нямецкая паліцыя затрымала больш за 20 тысяч мігрантаў без дакументаў. Гэта на 1300 менш, чым у верасні. Усяго ж са студзеня па кастрычнік 2023-га колькасць нелегальных мігрантаў перавысіла 112 тысяч, што ўжо значна больш, чым у 2022-м. Нямецкія пагранічнікі могуць спыняць машыны, правяраць дакументы і надглядаць багажнікі. З сярэдзіны кастрычніка таксама ўведзены кантроль на пунктах перасячэння граніцы з Чэхіяй і Швейцарыяй.



У Фінляндыі імкліва павялічваецца беспрацоўе

Згодна з дадзенымі Міністэрства эканамічнага развіцця і занятасці Фінляндыі, колькасць беспрацоўных, якія шукаюць работу, павялічылася на 23,7 тысячы чалавек з кастрычніка мінулага года. Пра гэта паведаміла фінская тэлерадыёкампанія Yle. У справаздачы міністэрства адзначаецца, што паралельна з ростам беспрацоўя ў краіне таксама адзначаецца скарачэнне колькасці працоўных месцаў. Усяго ў кастрычніку было адкрыта 102 тысячы вакансій, што на 58,6 тысячы менш, чым год таму. Агульная колькасць беспрацоўных у Фінляндыі на канец кастрычніка склала крыху больш за 256 тысяч чалавек. Гэта на 6,3 тысячы больш, чым у папярэднім месяцы.

ЭКСПАРТ ПРАЛЬНЫХ МАШЫН ВЫРАС У ЧАТЫРЫ РАЗЫ

РОСТ ЭКСПАРТУ І СТАНОЎЧАЕ САЛЬДА

Як паведаміў Пётр Пархомчык, па выніках студзеня — кастрычніка бягучага года валавы ўнутраны прадукт склаўся на ўзроўні 103,8 % да мінулагодняга перыяду. «Аб'ём прамысловай вытворчасці за 10 месяцаў 2023 года склаў 108 % да адпаведнага перыяду 2022 года, пры гэтым прырост да ўзроўню студзеня бягучага года склаў 12,1 %», — дадаў ён.

З улікам бягучай дынамікі ў прамысловым комплексе, урад прагназуе, што задача, пастаўленая кіраўніком дзяржавы па росце прамысловай вытворчасці на ўзроўні 105–107 %, будзе выканана па выніках года. Што датычыцца тэмпаў росту выручкі, па выніках дзевяці месяцаў у прамысловасці захоўваецца дадатная дынаміка — 110,1 % да студзеня – верасня мінулага года. Рэнтабельнасць продажаў у прамысловасці — 9,5 % пры ўзроўні гэтага паказчыка ў цэлым па краіне 7,4 %. Намінальная налічаная сярэднямесячная зарплата ў прамысловасці ў верасні склала 2124 рублёў, што вышэй за рэспубліканскі ўзровень.

Віцэ-прэм'ер адзначыў, што экспарт тавараў і паслуг за дзевяць месяцаў гэтага года складае 104,8 % да адпаведнага перыяду мінулага года, што апярэджвае ўстаноўлены мэтавы параметр на гэты перыяд. «Сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі склалася станоўчае, — падкрэсліў Пётр Пархомчык. — Захоўваюцца высокія тэмпы росту экспарту тавараў — 107,8 %. У натуральным выяўленні вырас экспарт пральных машын у чатыры разы, легкавых аўтамабіляў — практычна ў тры разы, тэлевізараў і маніторaў — у 2,2 раза, нафтапрадуктаў — у два разы».

Што датычыцца высокатэхналагічных тавараў, то іх доля (4,4 % за дзевяць месяцаў бягучага года) у агульным аб'ёме экспарту расце. Як звярнуў увагу намеснік прэм'ер-міністра, гэта найлепшы паказчык за апошнія гады.

У наступным годзе плануецца нарасціць аб'ёмы экспарту ў Расійскую Федэрацыю і краіны далёкай дугі. Што датычыцца бягучага года, у структуры экспарту краіны адбыліся істотныя змены. У прыватнасці, удалося поўнасцю пераарыентаваць гандлёвыя плыні з недружалюбных краін. У выніку вырас экспарт на рынкі дружалюбных краін. Доля дружалюбных краін у экспарце павялічылася на 14 %. Найбольшы рост экспарту адбыўся ў краіны ЕАЭС і ў краіны Азіі. За дзевяць месяцаў экспарт тавараў у Расію вырас на 19,7 %.

«Рост экспарту забяспечаны ў тым ліку за кошт выкарыстання вытворцамі механізмаў падтрымкі, якія існуюць, — канкрэтызаваў віцэ-прэм'ер. — У бюджэце на 2024 год на мэты падтрымкі экспарту прадугледжана на 20 % больш, чым у 2023 годзе. Акрамя таго, у прапрацоўцы новыя інструменты падтрымкі экспарту на рынках краін далёкай дугі. Так, плануецца прадаставленне фінансавання беларускім арганізацыям на мэты стварэння на тэрыторыі замежных дзяржаў уласных вытворчасцяў з удзелам беларускага капіталу і з выкарыстаннем беларускай сыравіны, матэрыялаў і камплектуючых».

ТЭХНАЛАГІЧНЫ І САЦЫЯЛЬНЫ ЭФЕКТ ІМПАРТАЗАМЯШЧЭННЯ

Сёлета для падтрымкі рэальнага сектара эканомікі ўрадам было прынята звыш 30 прававых актаў. Дапамога аказвалася вытворцам машынабудаўнічай, металургічнай, нафтахімічнай галін, а таксама лёгкай і дрэваапрацоўчай прамысловасці.

Для беларускіх спажыўцоў была зменшана цэнавая нагрузка на энергарэсурсы за кошт зніжэння цаны на газ. Па словах намесніка кіраўніка ўрада, гэта стала магчымым дзякуючы дасягнутым дамоўленасцям на ўзроўні кіраўнікоў Беларусі і Расіі.

«Прыняты адпаведныя меры па абароне ўнутранага рынку, — заўважыў віцэ-прэм'ер. — У прыватнасці, уведзены абмежаванні на вывад з краіны айчыннай сыравіны: ільновалакна і неапрацаваных скур буйной рагатай жывёлы, неабходных беларускай лёгкай прамысловасці. Цяпер вывад гэтай сыравіны на экспарт магчымы толькі пры наяўнасці ліцэнзіі. У дрэваапрацоўцы ўведзена ліцэнзаванне імпарту асобных відаў тавараў з драўніны».

Для замяшчэння імпарту ў прамысловасці ў сярэднетэрміновай і доўгатэрміновай перспектыве будуць рэалізаваны інвестыцыйныя праекты ва ўсіх рэгіёнах Беларусі, у тым ліку з прыцягненнем дзяржаўнага крэдыту Расійскай Федэрацыі. На ўзроўні Мінпрамгандлю Расіі і Міністэрства прамысловасці Беларусі ўзгоднена рэалізацыя 23 імпартазамяшчальных праектаў з агульным аб'ёмам інвестыцыйных затрат 105 мільярдаў расійскіх рублёў. Па словах Пятра Пархомчыка, па 13 праектах ужо заключаны крэдытныя дагаворы з банкамі, падпісаны кантракты на пастаўку абсталявання. Першыя пяць праектаў будуць завершаны ў 2025 годзе. «Рэалізацыя названых праектаў істотна палепшыць тэхналагічны ўзровень нашых прадпрыемстваў, — рэзюмаваў віцэ-прэм'ер. — Але эфект будзе і для расійскіх спажыўцоў — зніжэнне залежнасці ад імпарту камплектуючых і тэхнікі».

Напрыклад, на «Гомсельмашы» будзе арганізавана ўласная вытворчасць камплектуючых для камбайнаў. Пры гэтым будуць забяспечаны і патрэбы расійскага «Растсельмаша» ў гэтай прадукцыі. Чакаецца, што экспарт мостакамплектаў і кампанентаў механічных перадач у Расію павялічыцца ў некалькі разоў. На прадпрыемствах холдынга «АМКАДОР» плануецца стварыць вытворчасць зусім новых харвестэрных і форвардэрных маніпулятараў, новыя лінейкі вядучых кіруемых і некіруемых тандэмных мастоў, гідрамеханічных перадач. Будуць пашыраны магутнасці па вытворчасці лесанарыхтоўчай тэхнікі. Як звярнуў увагу Пётр Пархомчык, рэалізацыя праектаў забяспечыць і сацыяльны эфект: дадаткова будуць створаны 632 новыя рабочыя месцы і больш як 350 мадэрнізаваных.

«Кіраўнік дзяржавы перад рэальным сектарам эканомікі паставіў сур'ёзную задачу — забяспечыць у бягучым годзе рост выпуску імпартазамяшчальнай прадукцыі не менш як 10% адносна 2022 года, — нагадаў намеснік прэм'-ер-міністра. — Задача няпростая, але вырашальная. За дзевяць месяцаў вырабляна 74 % імпартазамяшчальнай прадукцыі ад гадавога задання».

ПАВЫШАНЫ ПОПЫТ НА АЙЧЫННЫ АЎТАМАБІЛЬ

Расказаў Пётр Пархомчык і аб рэалізацыі даручэння Прэзідэнта, якое звязана з арганізацыяй вытворчасці айчыннага электрамабіля да канца 2025 года. «Работа арганізавана адначасова па двух кірунках, — канкрэтызаваў ён. — Нацыянальнай акадэміяй навук вядзецца работа па стварэнні прамысловай вытворчасці электрамабіляў з максімальнай лакалізацыяй на базе кампанентнай базы, распрацаванай беларускімі вучонымі. У маі 2023 года Аб'яднанаму інстытуту машынабудавання перададзены ўзор электрамабіля JAC для аналізу магчымасці выкарыстання ў ім айчынных распрацовак. З кітайскай кампаніяй заключаны дагаворы па тэхнічным узаемадзеянні».

Паралельна заводам «БЕЛДЖЫ» праводзіцца работа па вываду на рынак электрамабіля айчыннай вытворчасці. Узор аўтамабіля з рухавіком унутранага згарання ў чэрвені 2023 года перададзены ў Аб'яднаны інстытут машынабудавання НАН для яго пераабсталявання ў электрычны. Плануецца, што ўзор першага электрамабіля будзе прэзентаваны да канца бягучага года.

Віцэ-прэм'ер паведаміў, што бягучая сітуацыя на рынку стварае перадумовы для далейшага пашырэння вытворчасці завода «БЕЛДЖЫ» з павелічэннем магутнасці да 120 тысяч аўтамабіляў у год пры двухзменным рэжыме працы. «Калі ў мінулым годзе заводам было выраблена 25 тысяч аўтамабіляў, то сёлета створана 60 199 аўтамабіляў, — гэта значыць ужо выканана гадавое заданне, — дадаў ён. — Прадалі 59 982 аўтамабіля, з іх практычна 80 % — у Расійскую Федэрацыю. Пры гэтым мы бачым добрыя перспектывы для нарошчвання аб'ёмаў продажаў легкавых аўтамабіляў у гэты рэгіён».

Па словах віцэ-прэм'ера, расце попыт на айчынны аўтамабіль і на ўнутраным рынку. Па выніках продажаў у бягучым годзе аўтамабілі завода займаюць першае месца.

УЗАЕМАВЫГАДНАЕ ПАРТНЁРСТВА

Гаворачы аб супрацоўніцтве з Расійскай Федэрацыяй, віцэ-прэм'ер спыніўся на мікраэлектроніцы. З расійскімі партнёрамі падпісаны адпаведныя дакументы, накіраваныя на ўзаемадзеянне ў гэтым кірунку, у тым ліку дарожная карта, якая прадугледжвае стварэнне чатырох новых тэхналогій для асваення вытворчасці 88 вырабаў.

«Акрамя таго, падпісаны міжурадавае пагадненне аб супрацоўніцтве ў галіне развіцця станкаінструментальнай прамысловасці і дарожная карта, якая прадугледжвае пакрокавы план супрацоўніцтва, — дадаў Пётр Пархомчык. — У прыватнасці, стварэнне цэнтраў кампетэнцый на базе станкабудаўнічых прадпрыемстваў Беларусі і Расійскай Федэрацыі, рэалізацыю навукова-тэхнічнай праграмы Саюзнай дзяржавы, накіраванай на распрацоўку вузлоў і кампанентаў для станкабудаўнічых прадпрыемстваў».

Па яго словах, у рамках дарожнай карты плануецца рэалізацыя праекта «Саюзны станок», накіраванага на стварэнне запатрабаванага станка з беларускіх і расійскіх камплектуючых — гэта значыць, са стапрацэнтнай лакалізацыяй.

Паралельна вядзецца пошук кітайскіх партнёраў, гатовых да стварэння на тэрыторыі Беларусі вытворчасцяў буйнавузлавой зборкі станочнага абсталявання з наступнай яе лакалізацыяй. Вядзецца размова і аб пастаўках абсталявання для мадэрнізацыі станкабудаўнічых прадпрыемстваў. Шэраг кітайскіх кампаній ужо выказалі гатоўнасць развіваць супрацоўніцтва з беларускімі станкабудаўнічымі заводамі.

«Сыход з рынку Саюзнай дзяржавы пастаўшчыкоў тэхналагічнага абсталявання з недружалюбных краін паслужыў айчынным станкабудаўнічым арганізацыям дадатковым імпульсам для развіцця, — рэзюмаваў намеснік прэм'ер-міністра. — Паводле ацэнак спецыялістаў, патрэба беларускага рынку ў станочным абсталяванні складае 1,5 тысячы адзінак, расійскага рынку — каля 10 тысяч адзінак. Паводле ацэнак, на гэтым этапе расійскія вытворцы могуць забяспечыць каля 30 % ад патрэбы ў станках, а да 2030 года — каля 50 %. Такім чынам, у нашых вытворцаў ёсць усе шанцы заняць у гэтым сегменце рынку нішу, якая з'явілася».

Гэта датычыцца таксама многіх кірункаў прамысловага комплексу краіны, які развіваецца ў нагу з часам, а па некаторых аспектах нават апераджае яго.

Вераніка КАНЮТА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Па сутнасці

Сваіх не кідаем

О, летуценнае дзяцінства. Калі басанож у думках уздымаешся над непразлазным гушчаром пушчаў, над вірлівымі рэкамі, калі падарожнічаеш па сівых сутарэннях замкаў ды раскошы палацаў... Калі ты ў марах разам з нашымі воінамі бяжыш у атаку, а з будаўнікамі — дакранаешся да неба на вышыні новабудоўляў. Тады ўсе дарослыя здаюцца вялікімі і дужымі, разважлівымі і мудрымі. І ты сам марыш стаць такім жа і адчуваеш сябе добрым і шчырым. Бязгрэшным. З чаго яно пачынаецца — пачуццё граху, а пасля ўсё жыцце — барацьба з ім? Калі першы раз кідаеш сваіх. Напрыклад, пайшоў з сям'ёй у лес, убачыў там змяю і, апанаваны страхам, даў на пяты. А твае самыя галоўныя людзі засталіся за спінай, сам-насам з небяспекай. І адчуванне палёту — у мінулым.

Калі падрасцеш, пасталееш, адчуеш моц — не фізіялагічную, эмацыянальную, — захочаш пачуваць сябе сапраўдным чалавекам, ты больш ніколі не кінеш сваіх. Так адбываецца і з краінамі. Сапраўдныя не кідаюць сваіх. Як гэта? А так, як у Беларусі.

Давайце паразважаем. СССР быў імперыяй дасягненняў і моцы. Не заўжды гігант заўважаў асобу, чалавека. То была эпоха грандыёзных праектаў. Людзей навучыліся цаніць пасля Вялікай Айчыннай вайны. А як па-іншаму? То ж пераможцы! З аднаго боку, і адукацыю дапамагалі атрымаць, і на працу ўладкоўваць. Інтэрнат, пасля кватэра. Нават пуцёўку на адпачынак. Усё дзеля людзей. З іншага — інвалідаў вайны хавалі ад насельніцтва вялікіх гарадоў за мурамі манастыроў. Сваіх не кідалі, але стваралі штучную карцінку. А пасля надышоў крах і кінулі ўсіх. Калі ўвогуле забыліся на воінаў-інтэрнацыяналістаў, калі адабралі, вырвалі зберажэнні ў працаўнікоў з мазалямі на руках.

Забыліся на сваіх, кінулі. Пад махавік перамен, трансфармацыі ідэалаў. Здавалася, што магутная дзяржава з савецкім чалавекам згуляла ў напарсткі. А тут яшчэ і такая спакуса. З экрана. Вось ён — свет сапраўднага капіталізму. Там, маўляў, сваіх не кідаюць, выратоўваюць нават з палону. А тут наіўныя людзі савецкага рэалізму — у пастцы перабудовы, нязвыклых зносін, правіл дзікага рынку. «Ратуйце» — чыталася тады ў вачах мільёнаў. Ды ніхто не спяшаўся.

Беларусам пашчасціла. Сваіх не кідаем. То была дзяржаўная палітыка. Сваіх не кідаем у пастку крыміналу, сваіх не кідаем у лапы падманлівага капіталізму і драпежнай прыватызацыі. Сваіх не кідаем — гэта ж яшчэ і пра сацыяльна арыентаваную палітыку дзяржавы. Дзеці, старыя, людзі з абмежаваным магчымасцямі... Так, зразумела. А яшчэ ж кожны юны талент і выпускнік ВНУ. Нават захаванне прафесійных каледжаў — гэта ж таксама каб не кінуць не самых выбітных вучняў. Захаванне дзяржаўных актываў і стварэнне развітой сеткі сацыяльных паслуг — таксама ў парадыгме «сваіх не кідаем»...

Але гэтыя ўсе працэсы вельмі агульныя, таму і незаўважныя. Сэрцы людзей крануюць трагічныя гісторыі асобнага чалавека. Добрыя тэндэнцыі мы ўспрымаем як штодзённасць. А вось персаніфікацыя падзеі — іншае.

Бог ставіць усе кропкі над беларускім «і». Так адбылося і з намі. Колькі было нараканняў на ўлады і падчас кавіду, і падчас падзей 2020 года. А пасля разумныя зразумелі, нават многія неверагодныя — уцямілі, што спачатку эканоміку, а пасля і краіну ўвогуле выратавалі ад знішчэння. Украінскі сцэнарый разгарнуўся б на нашых землях, а нашы людзі былі б укінуты ў гарніла ваеннага ліхалецця. Некаторыя з беларусаў апынуліся ў такім пекле. Спачатку нашы дальнабойшчыкі ў прасторы ўкраінскай неверагоднасці, а цяпер — у сектары Газа. Усіх не кінулі, усіх выратавалі па прамым распараджэнні кіраўніка дзяржавы. Бо гэта ж так па-ягонаму, па-бацькоўску: «Самае дарагое — хлеб, а самае каштоўнае — людзі».

То былі розныя аперацыі выратавання, са сваёй спецыфікай. Наш КДБ правёў філігранную работу. Дэталі так і застануцца набыткам лекцый у закрытых аўдыторыях. Адно можна сказаць — замест галівудскіх герояў ёсць у Беларусі свае, родныя і рэальныя. На тое была палітычная воля кіраўніка дзяржавы. Сваіх не кідаем. Кропка. Інакш быць не можа.

Але — магло б. Як было ў пачатку 90-х. Як магло паўтарыцца ў 2020-м. Кінуць — ва ўсіх сэнсах — спрабуюць так званыя эліты пятай калоны. Спачатку адкрыта спрабавалі кінуць у бойку з Расіяй. Не выйшла. Цяпер кідаюць тых, хто ім паверыў. Столькі абяцанак надавалі паплечнікам — і ніводную не выканалі. Кінулі сваіх. Кагосьці — у бойку на тэрыторыі Украіны. Іншых неверагодных — па варшаўскіх і вільнюскіх хостэлах. Не жывуць — існуюць. А фальшыўкі пятай калоны зноў і зноў абяцаюць і цягнуць людзей у пастку. А самі нават не могуць забяспечыць ананімнасць, якую абяцаюць на кожным кроку, — зноў кідаюць даверлівых дурняў, кібербяспеку. А грошы ж ад сваіх бенефіцыяраў на гэта атрымліваюць, як і на «палітвязняў», якіх таксама кінулі. Не таннае жыццё эліт збеглай эміграцыі ў еўропах. Каб правадырам неверагодных жыць добра, застаецца, як і заўжды, кідаць сваіх. Хацелі ўсю краіну, а атрымліваецца толькі з адурманенымі калабарантамі.

А мы — як раней, так і ў будучыні — сваіх не кідаем. Гэта не толькі памкненні мужных вайскоўцаў, гэта пазіцыя нашага кіраўніцтва краіны. З адной рэмаркай — свае — гэта ўсе беларусы.

Яўген ПУСТАВОЙ.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
23 ЛІСТАПАДА 2023 г.
ЧАЦВЕР
№ 22 (15966)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Маладыя імёны

Хелена МЕРААІ:

«Пры ўсёй магіі тэлебачання важна заставацца сабой»

Яна — таемны агент «Дзённікаў шоу Фактар.by», вядучая маладзёжнага праекта «ПІН_КОД» на тэлеканале «Беларусь 2» і проста прыгожая, творчая дзяўчына. Верыць, што шчаслівымі патрэбна быць найперш для саміх сябе, і, напэўна, натхняе многіх глядзець на жыццё нестандартна і крэатыўна. Пра тое, ці ўбачым мы яшчэ Хелену Мерааі на сцэне як спявачку, ці спазнала яна ўжо канчаткова магію тэлебачання і чым захапляецца сёння, даведаліся ў нашай гераіні пры сустрэчы.

— Як вам у ролі сакрэтнага агента на шоу «Фактар.by»?

— Часцей за ўсё «Дзённікі» ў нас пяцівхвілінныя, але здараецца, што хронаметраж змяняецца, бо вельмі хочацца распавесці пра тое, што адбываецца за кадрам праекта. А гэта вялікі аб'ём матэрыялу, хоць і рэжам часам яго бязлітасна. Аднак вельмі хочацца перадаць той настрой і атмасферу, якія пануюць на здымачнай пляцоўцы. І з кожным сезонам, лічу, нам усё лепш тое ўдаецца. У першым сезоне шоу (тады яно яшчэ называлася «Х-фактар. Беларусь») я знаходзілася за кадрам, а ў другім сезоне мяне вывелі на экраны, і цяпер працую ў такім фармаце. Але не стаўлю сябе на адну прыступку з вядучымі і настаўнікамі праекта, бо выконваю ролю закуліснага мадэратара. Імкнуся быць для ўдзельнікаў на праекце блізкім сябрам, з якім можна паплакаць і пасмяяцца. Бо на такога кшталту праектах падтрымка вельмі важная для кожнага, хто выходзіць на сцэну. Я гэта ведаю па ўласным вопыце. І таму, як ніхто іншы, разумею іх перажыванні і эмоцыі.

— Дзе працаваць цікавей: у кадры ці за ім?

— Мне заўсёды падабаецца адкрываць новае, бо тады ўзнікае жаданне ўсё разгледзець, унікнуць у сутнасць. Так, з задавальненнем займаюся як мантажом, люблю пісаць сцэнарыі, так і працую ў кадры. І апошняе, мабыць, усё ж перавешвае, бо дае магчымасць радаваць іншых. Хаця, калі працуеш на мантажы, то там можна назіраць за сапраўдным цудам, як усё ў кадры перайначваецца, прычым можна зрабіць як лепш, так і горш. Альбо паламаць, альбо стварыць з нічога штосьці па-сапраўднаму прыгожае. Там безліч граняў. Вядучы — гэта ўжо праца, дзе часам даводзіцца быць самой і стылістам, і грымёрам, што таксама дае прастору для самавыяўлення. Таму ў праектах, дзе я задзейнічана сёння, магу рознабакова шукаць сябе.

— Магія тэлебачання для вас у чымсьці яшчэ засталася?

— Не магу сказаць, што на тэлебачанні можна ўсё спазнаць. Ёсць рэчы, якія, можа, заўсёды для мяне будуць неспасцігальныя, бо часам трэба змірыцца, што гэта працуе так і не іначай. Калі я прыйшла на тэлебачанне, то мне гаварылі, што гэта сфера, якая ў нейкі момант проста не адпускае людзей. Яны жывуць на працы. А цяпер я пражываю ўсё гэта сама, без свят, выхадных і адпачынку. Так, мы жывыя людзі, і часам нам цяжка, але на такія ахвяры мы ідзём дзеля саміх сябе. І калі хочаш нечага дасягнуць у гэтай прафесіі ці ў нейкай з тых, дзе ёсць творчасць, то спрацоўвае толькі такі варыянт. Свет і яго пабудова там спазнаецца праз самаахвярнасць, рэгулярныя трэніроўкі. Працэс гэты бясконцы, і ты пастаянна нешта «капаеш» і вывучаеш новае. Напрыклад, я працую з многімі шэф-рэдактарамі, якія мяне накіроўваюць. І бачу, колькі яны ўсяго глядзяць, каб развівацца, хоць і таленавітыя, і ўжо не адзін маштабны праект зрабілі.

(Заканчэнне на 8-й стр. «ЧЗ».)

Лакацыі актыўнасці

За патрыятызм і бяспеку — разам

Міністр па надзвычайных сітуацыях Вадзім СІНЯЎСКІ і першы сакратар Цэнтральнага камітэта Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі Аляксандр ЛУК'ЯНАЎ падпісалі Пагадненне аб узаемным супрацоўніцтве. Яго абнаўленне і падпісанне абумоўлена цяперашнімі рэаліямі, дзяржаўнай маладзёжнай палітыкай у галіне грамадзянскага і патрыятычнага выхавання моладзі, навучання яе асновам бяспекі жыццядзейнасці.

Прадугледжваецца, што ратавальнікі на базе сваіх тэрытарыяльных падраздзяленняў навучаць моладзь метадам папярэджання пажараў, надзвычайных сітуацый, правілам пажарнай бяспекі, а таксама спосабам і метадам работы з людзьмі па прапагандзе бяспекі жыццядзейнасці, а таксама акажуць у рамках сваёй кампетэнцыі садзейнічанне і падтрымку ў пытаннях, якія ўзнікаюць.

Акрамя таго, бакі будуць узаемадзейнічаць пры распрацоўцы і правядзенні мерапрыемстваў, акцый, конкурсаў і іншых сацыяльных праектаў, накіраваных на прапаганду бяспекі жыццядзейнасці, прапаганду пажарна-ратавальнага спорту, здаровага ладу жыцця, дабрачыннасці, актыўнай стваральнай грамадзянскай пазіцыі і патрыятызму.

Цяпер у сістэме МНС функцыянуе 156 пярвічных арганізацый БРСМ, якія аб'ядноўваюць больш як пяць тысяч членаў. Штогод праводзіцца шэраг значных мерапрыемстваў і акцый, такіх як «Адзін дзень з МНС», «Не пакідайце дзяцей адных!», «Бяспека ў кожны дом», «Канікулы без дыму і агню», «Моладзь — за бяспеку», «Не прапальвай сваё жыццё!», «Бяспечны Новы год», «Да абароны Айчыны гатовы!», «Дзень Бяспекі», «Бяспека ў нашых руках», «У школу з Добрым Сэрцам!», «У цэнтры ўвагі — дзеці!», «Моладзь — за чысты горад», «Моладзь — за бяспеку і правапарадак», «Праспяваем гімн разам!», «Летні патруль». Таксама сёлета ў Дзень народнага адзінства, які падкрэслівае пераемнасць пакаленняў, непахіснасць і самадастатковасць беларускай нацыі і дзяржавы, праведзены велапрабег «Адзінствам моцная Беларусь».

У МНС удзяляецца вялікая ўвага развіццю моладзі і навучанню яе правілам бяспечных паводзін, навыкам дзеянняў у надзвычайных сітуацыях. Арганізацыяй, якая дае магчымасць аб'яднацца на аснове сумесных інтарэсаў для вывучэння асноў бяспекі жыццядзейнасці, стала Беларуская маладзёжная грамадская арганізацыя ратавальнікаў-пажарных.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Прафарыентацыя

АД МАШЫНАБУДАВАННЯ ДА КУЛІНАРЫІ І ДЫЗАЙНУ

Якую адукацыю выбраць: сярэднюю спецыяльную або прафесійна-тэхнічную? Пасля дзявятага класа ці пасля адзінаццатага? А можа быць, накіравацца ў ВНУ? Перад такім выбарам стаяць шмат выпускнікоў.

ПРАФЕСІЙНАЯ ДЫЯГНОСТЫКА

— Нягледзячы на тое што на дварэ яшчэ лістапад, будучым абітурыентам ужо варта задумацца аб выбары далейшай прафесіі, — раіць **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі, начальнік упраўлення прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Аляксандра ПЯТРОВА**. — Рэкамендую прайсці прафесійную дыягностыку. У гэтым дапаможа сістэма «ПрофіТэст», створаная Рэспубліканскім інстытутам прафесійнай адукацыі якраз для гэтых мэт.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
23 11 2023 г.

камертон настрою

«Вёска — тэрыторыя развіцця»

Рэспубліканскі форум сельскай моладзі пад такой назвай пройдзе сёння і заўтра ў Клецкім і Нясвіжскім раёнах Мінскай вобласці. Мерапрыемства аб'яднае каля ста ўдзельнікаў з усіх абласцей Беларусі. Гэта моладзь, якая працуе на прадпрыемствах аграпрамысловага комплексу, а таксама ў вёсцы ў сацыяльнай сферы. Фактычна на форум запрошаны аграномы, заатэхнікі, ветурачы, механізатары, камбайнеры, кіроўцы, настаўнікі сельскіх школ, работнікі сферы культуры, медработнікі.

Форум накіраваны на наглядную дэманстрацыю найлепшага вопыту па стварэнні ўмоў для пражывання і працы моладзі ў вёсцы і падтрымку ініцыятыў сельскай моладзі, абмен сучаснымі практыкамі.

Двухдзённая праграма мерапрыемства насычана дзелавым і культурна-забаўляльным складнікамі.

Плануецца арганізаваць работу тэматычных секцый.

На сельгаспрадпрыемствах ААТ «Грыцкевічы», ААТ «Гарадзейскі цукровы завод», СВК «Агракамбінат «Сноў» (Нясвіжскі раён) і ААТ «Кухчыцы» (Клецкі раён) удзельнікі форуму абмяркуюць з кіраўніцтвам прадпрыемстваў актуальныя пытанні, якія хвалююць моладзь, пазнаёмяцца з новымі падыходамі ў рабоце з маладымі працаўнікамі вёскі, у тым ліку і маладымі спецыялістамі.

Гэтую ж практыку возьмуць за аснову пры наведванні Нясвіжскай цэнтральнай раённай бальніцы і дзіцячага садка № 7 Нясвіжа.

Падчас афіцыйнага адкрыцця форуму будуць узнагароджаны пераможцы рэспубліканскага конкурсу «Моладзь за ўраджай» — маладзёжны камбайнавы экіпаж з бялыніцкага СВК «Калгас «Радзіма» ў складзе старшага камбайнера Яўгена Шалкоўскага і камбайнера Віктара Васільева. Хлопцы намалацілі 4510 тон збожжа.

У абсалютных пераможцах конкурсу — малады кіроўца ЗАТ «Агракамбінат «Зара» (Магілёўскі раён) Раман Сарокін, які перавёз 6012 тон збожжа ад камбайнаў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

АД МАШЫНАБУДАВАННЯ ДА КУЛІНАРЫІ І ДЫЗАЙНУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Сістэма аналізуе здольнасці абітурыента і прапануе пералік спецыяльнасцяў, якія найбольш яму падыходзяць. За апошнія два месяцы платформай скарысталіся больш як 110 тысяч навучэнцаў.

Важна прайсці ўсе блокі тэстаў, якія прапануе сайт. Гэта дазволіць найбольш дакладна вызначыць сферу інтарэсаў і падказаць, у якіх установах адукацыі можна асвоіць цікавую спецыяльнасць.

ВЫЗНАЧЫЦЦА З ТРАЕКТОРЫЯЙ

«Затым пераходзім на сайт установы адукацыі і ўдзельнічаем ва ўсіх актыўнасцях, якія там прапануюць, — падкрэслівае Аляксандра Пятрова. — А іх вельмі шмат: гэта і дні адкрытых дзвярэй, і майстар-класы, і шосты школьны дзень. Я рэкамендавала б разглядаць усе ўстановы адукацыі ў краіне, якія вас цікавяць. Паколькі яны даволі раўнамерна размеркаваны па рэгіёнах, вы можаце адштурхоўвацца ад магчымасці навучацца не толькі ў вашым горадзе, але і ў іншых абласных цэнтрах і населеных пунктах. Акрамя таго, выбар у нас досыць вялікі — гэта больш як 100 спецыяльнасцяў і адпаведна 250 кваліфікацый на ўзроўні прафесійна-тэхнічнай адукацыі і каля 200 спецыяльнасцяў — на ўзроўні сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Спецыяльнасці вельмі розныя: пачынаючы ад тэхнічных, дзе рыхтуюць кадры для сферы прамысловасці, будаўніцтва, ІТ, да педагагічных і медыцынскіх на ўзроўні сярэдняй спецыяльнай адукацыі».

